(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
"ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ
І ФАЛЬКЛОРУ ІМЯ К. КРАПІВЫ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ"

УДК 398.41:59 (476+430)

Вырва
Ірына Аляксандраўна

МІФАПАЭТЫЧНАЯ СЕМАНТЫКА ВОБРАЗАЎ СВОЙСКІХ ЖЫВЁЛ У ТРАДЫЦЫЙНЫМ БЕЛАРУСКІМ І НЯМЕЦКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

Аўтарэферат дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці 10.01.09 – фальклярыстыка

Мінск, 2008

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Работа выканана ў аддзеле фальклярыстыкі Дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі"

Навуковы кіраўнік: Валодзіна Т.В., кандыдат філалагічных навук, дактарант ДНУ "ІМЭФ імя К. Крапівы НАН Беларусі"

Афіцыйныя апаненты: Ненадавец А.М., доктар філалагічных навук, прафесар (загадчык кафедры грамадскіх дысцыплін Бабруйскага філіяла УА "Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт")
Васілевіч У.А., кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры этналогіі і фальклярыстыкі УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка"

Апаніруючая арганізацыя: УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны"

Абарона адбудзецца 15 студзеня 2009 г. у 13 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 пры Дзяржаўнай навуковай установе "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі" па адрасу: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, к. 2, п. 302 (тэлефон вучонага сакратара: 284 29 24, e-mail: a_hurko@basnet.by).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі".

Аўтарэферат разасланы "12" снежня 2008 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук, дацэнт Г.І. Каспяровіч

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Вывучэнне фальклорнай сімволікі з'яўляецца адной з найбольш значных тэм у працэсе даследавання асаблівасцей і заканамернасцей развіцця еўрапейскай, і ў прыватнасці беларускай, культурнай традыцыі. Параўнальнае вывучэнне фальклорнай сімволікі розных народаў абумоўлена агульнасцю мадэлей міфапаэтычнай карціны свету, гістарычным і культурным узаемапранікненнем.

Значнае месца ў вуснапаэтычнай творчасці як беларусаў, так і немцаў займаюць зоаморфныя вобразы, бо жывёлы спрадвеку ігралі важную ролю ў гаспадарчым і побытавым жыцці, што не магло не адбіцца на фарміраванні карціны свету кожным народам. Анімалістычныя вобразы, замацаваныя ў фальклорных творах, нясуць у сабе, хаця і ў апрацаваным выглядзе, рэшткі старажытнай міфалогіі, якая складала аснову светапогляду народа.

Нягледзячы на тое, што і айчынная, і нямецкая навука займаліся зборам і вывучэннем фальклору ўжо ў XIX ст., сімвалізм вобразаў свойскіх жывёл застаўся па-за ўвагай даследчыкаў і да нашага часу сістэматычна не вывучаўся. У дысертацыйнай рабоце ўпершыню праводзіцца параўнальны аналіз фальклорнага матэрыялу двух народаў, які дазваляе даследаваць сістэму ўяўленняў, звязаных з месцам вобразаў менавіта свойскіх жывёл у адпаведных карцінах свету.

Вывучэнне зоаморфных вобразаў вельмі важна для ўсведамлення сутнасці старажытных вераванняў, якія склаліся яшчэ ў архаічным грамадстве, для разумення эвалюцыі светапогляду і фальклорнай традыцыі народа пасля пераходу да земляробчай дзейнасці і далей, пасля прыняцця хрысціянства. Адметнасць беларускай фальклорнай традыцыі заключаецца ў добрай захаванасці архаічных рысаў, а таксама ў арганічным сінтэзе язычніцкай і хрысціянскай светапоглядных сістэм.

Актуальнасць даследавання абумоўлена неабходнасцю вывучэння спецыфікі міфалагічнага светапогляду праз сімвалічныя вобразы найбольш звыклых для абедзвюх традыцый свойскіх жывёл. Важным з'яўляецца выяўленне адрозненняў і падабенстваў зоаморфных персанажаў, ступені іх архаічнасці і злучанасці з агульнай індаеўрапейскай традыцыяй. Разам з тым цікавасць прадстаўляе этнічная адметнасць, якая склалася пад уплывам геаграфічных, гістарычных, ментальных і іншых фактараў.

Даследаванне вобразаў свойскіх жывёл дазволіць дапоўніць карціну фальклорнай сімволікі беларусаў, рэканструяваць пэўны фрагмент духоўнай культуры. Супастаўленне з нямецкай традыцыяй спрыяе выяўленню кропак судакранання беларускай культуры з іншымі культурнымі традыцыямі, дае магчымасць прасачыць іх узаемаўплыў, а таксама вылучыць архаічныя індаеўрапейскія рысы і этнічныя асаблівасці, якія складаюць аснову этнічнай самаідэнтыфікацыі народа.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі. Тэма дысертацыі адпавядае прыярытэтнаму кірунку фундаментальных навуковых даследаванняў "10.3 Гісторыя культуры Беларусі, актуальныя праблемы яе сучаснага стану і перспектывы развіцця: раскрыццё рэгіянальнай і лакальнай разнастайнасці нацыянальнага фальклору, яго унікальнасці ў сферы духоўнай спадчыны народаў Еўропы". Дысертацыйная праца выканана ў межах наступных навуковых тэм: "Беларускі фальклор у агульнаславянскім кантэксце" (№ 20012251), якая распрацоўвалася ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі" ў рамках дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў "Даследаванне гісторыі, мастацтва, фальклору і этнакультурных традыцый Беларусі ў кантэксце славянскіх культур, еўрапейскай цывілізацыі, глабальнага развіцця і этнаканфесійных працэсаў у сучасных свеце ("Гісторыя і культура") (2001-2005 гг.)"; задання № 15 "Беларускі фальклор: арэальнае і тыпалагічнае, этнакультурная значнасць на сучасным этапе" (№ 20061107 "Гісторыя і культура") (2006-2010).

Мэта і задачы даследавання. Асноўная мэта дысертацыйнай работы – выяўленне шляхам параўнальнага аналізу асаблівасцей і агульных рыс семантыкі і функцыянальнасці вобразаў свойскіх жывёл у традыцыйным беларускім і нямецкім фальклоры.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

1. Вызначыць месца анімалістычнага элемента ў традыцыйнай карціне свету беларусаў і немцаў.
2. Вызначыць падабенствы ў семантыцы вобразаў свойскіх жывёл у беларускім і нямецкім фальклоры.
3. Вылучыць сістэму супадзення і адрознення канатацый зоаморфных вобразаў у складзе твораў беларускага і нямецкага фальклору, праінтэрпрэтаваць іх функцыянаванне ў духоўнай культуры беларусаў і немцаў.
4. Вызначыць дамінанты семантыкі асобных вобразаў свойскіх жывёл у беларускай і нямецкай фальклорнай традыцыі.
5. Прасачыць змену міфапаэтычнай семантыкі вобразаў свойскіх жывёл пад уплывам хрысціянізацыі.

Аб'ект і прадмет даследавання. Аб'ектам даследавання з'яўляюцца анімалістычныя вобразы ў традыцыйным беларускім і нямецкім фальклоры, прадметам – семантыка вобразаў свойскіх жывёл, заканамернасці яе ўзнікнення, існавання і развіцця, падабенства і адметнасці зоамарфізмаў у складзе карціны свету беларусаў і немцаў.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.

1. Зоаморфныя вобразы кадзіруюць прыродную і сацыяльную рэальнасці, з'яўляюцца сімвалічнымі адзінкамі традыцыйнай карціны свету. У сакральна арыентаваных кантэкстах яны суадносяцца з касмалагічнымі ўяўленнямі, уваходзяць у сферу міжсветавых дачыненняў, у будзённых – звязаны з гаспадарчай дзейнасцю і сацыяльным жыццём чалавека. Упершыню ў беларускай фальклярыстыцы зоаморфныя вобразы разглядаюцца ў межах асобнага коду.
2. Зоаморфныя вобразы ў беларускай і нямецкай фальклорнай традыцыі выяўляюць значную ступень падабенства, што абумоўлена як генетычна, падобнымі ўмовамі жыццядзейнасці, так і культурным узаемадзеяннем.
3. Глебай для фарміравання семантычных значэнняў вобраза з'яўляюцца розныя ўласцівасці, атрыбуты, асаблівасці пэўнай жывёлы ў кантэксце беларускай або нямецкай этнічнай традыцыі. У розных фальклорных жанрах вобразы свойскіх жывёл прадстаўлены з рознай інтэнсіўнасцю і маюць розную, часам супрацьлеглую, семантычную афарбоўку, выступаюць ад персаніфікацыі вышэйшых бостваў да ўвасаблення дэманалагічных істот. Ім уласцівыя амбівалентнасць, далучанасць да супрацьлеглых полюсаў Сусвету, медыятыўнасць. Асаблівасці семантыкі карэктуюцца ў адпаведнасці з унутранымі жанравымі законамі і адметнасцю ўспрыняцця той ці іншай жывёлы ў межах пэўнага соцыуму. Упершыню вызначана, як у залежнасці ад кантэксту адна і тая ж жывёла-сімвал можа дэманстраваць супрацьлеглую канатацыю, якая не заўсёды супадае ў беларускай і нямецкай традыцыі.
4. Сімвалічныя значэнні вобразаў свойскіх жывёл у беларускім і нямецкім фальклоры кансервуюць уплыў міфалагічных уяўленняў, а функцыянаванне гэтых вобразаў у традыцыйных фальклорных жанрах беларусаў і немцаў дэманструе шляхі генезісу і трансфармацыі іх семантыкі. Нямецкая традыцыя вызначаецца выпрацаванай сістэмай вышэйшай міфалогіі. Персанажы беларускай міфалогіі больш набліжаны да рэальнага, зямнога жыцця. Навуковая навізна палажэння – у супастаўляльным ракурсе разгляду.
5. Змена вобразнасці анімалістычнага кампанента, набыццё ім дадатковага альбо новага значэння адбываецца ў выніку сацыяльна-бытавых і гістарычных змен, сутыкнення розных культурных традыцый. Вобразы-сімвалы свойскіх жывёл у беларускім і нямецкім фальклоры вызначаюцца рознай ступенню захаванасці архаічных уяўленняў перыяду індаеўрапейскай еднасці і змены вобразнасці пад уплывам хрысціянізацыі. Новым навуковым вынікам з'яўляецца ўстанаўленне залежнасці семантыкі вобразаў свойскіх жывёл ад хрысціянскіх уяўленняў.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Асабісты ўклад дысертанта. Дысертацыйная работа з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем, дзе ўпершыню даследуецца вобразнасць свойскіх жывёл у кантэксце беларускай і нямецкай фальклорнай традыцыі. Усе палажэнні дысертацыі распрацаваны суіскальнікам самастойна на аснове беларускіх і нямецкіх фальклорных крыніц.

Апрабацыя вынікаў дысертацыі. Асноўныя палажэнні і вывады даследавання апрабаваныя на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях: VI Шырмаўскія чытанні (30 лістапада 2005 г., БДУ), "Беларуска-Руска-Польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія" (26 красавіка 2006 г., ВДУ), "Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час" (27 красавіка 2006 г., ГДУ), II Лепельскія чытанні (Лепель 2006), "Мова-Літаратура-Культура. Да 80-годдзя прафесара Л. М. Шакуна" (16–17 лістапада 2006 г., БДУ), VII Шырмаўскія чытанні (27 лістапада 2006 г., БДУ), пры падрыхтоўцы лекцый для студэнтаў Хумбальдт універсітэта (Берлін) у рамках праекта Corpus Coranicum .

Матэрыялы дысертацыі выкарыстаны для падрыхтоўкі тэматычных радыёпраграм у эфіры інтэрнацыянальнага вяшчання Белтэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь (радыёстанцыя "Беларусь") у рамках праекту знаёмства замежных слухачоў з беларускім фальклорам, прапаганды беларускай культуры за мяжой, інтэграцыі нацыянальнай навукі і культуры ў агульнаеўрапейскую культурную прастору.

Апублікаванасць вынікаў. Матэрыялы даследавання знайшлі адлюстраванне ў 14 публікацыях аўтара, сярод якіх 5 – у рэцэнзаваных навуковых часопісах, 2 артыкулы – у замежных зборніках навуковых прац, 7 – у зборніках артыкулаў і матэрыялаў навуковых канферэнцый. Агульны аб'ём артыкулаў у выданнях, уключаных у Спіс навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, складае – 1,35 аўтарскага аркуша.

Структура і аб'ём дысертацыі. Агульны аб'ём работы – 174 старонкі, з іх 109 старонак займае асноўны тэкст, які ўключае ўводзіны, агульную характарыстыку работы, тры главы з асобнымі параграфамі і заключэнне. Спіс крыніц, выкарыстаных пры напісанні работы, змяшчае 276 адзінак, 45 старонак займаюць дадаткі, у якіх вобразы свойскіх жывёл класіфікаваны па жанрах вуснапаэтычнай творчасці, дзе яны сустракаюцца, і па найбольш пашыраных матывах.

АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **Уводзінах** абгрунтоўваецца выбар і актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання, раскрываецца важнасць для айчыннай фалькларыстыкі параўнальнага даследавання фальклору ў цэлым, і вобразаў свойскіх жывёл у

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

прывытнасці. Дадзена агульная характарыстыка ступені вывучанасці праблемы анімалістычнай вобразнасці ў айчыннай і замежнай фальклярыстыцы, акрэслены агульны кірунак даследавання.

У **Агульнай характарыстыцы работы** раскрываюцца мэта, аб'ект і прадмет даследавання, сфармуляваны асноўныя тэарэтычныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, адзначана апрабацыя вынікаў дысертацыі і іх апублікаванасць.

У першай главе **"Аналітычны агляд літаратуры"** разглядаюцца пытанні гісторыі збірання і даследавання фальклорных тэкстаў з зоаморфнымі вобразамі, характарызуюцца крыніцы, на аснове якіх было выканана даследаванне. Усебаковаму раскрыццю тэмы спрыяе выкарыстанне сінхроннага і дыяхроннага аналізу. Выкарыстаны таксама метады гісторыка-генетычнага і гісторыка-тыпалагічнага параўнання. Спалучэнне метадаў дае магчымасць найбольш поўна разгледзець утварэнне семантычных падабенстваў генетычна не звязаных паміж сабой прадметаў у выніку падобных умоваў развіцця і генетычна-роднасных – у працэсе гістарычна абумоўленых разыходжанняў.

Збіральнікі беларускага фальклору пакінулі багатую спадчыну тэкстаў самых розных жанраў, у многіх з якіх адлюстраваны вобразы свойскіх жывёл. Асаблівае значэнне для даследавання зоаморфнай сімволікі даюць працы такіх беларускіх збіральнікаў і даследчыкаў, як Ч. Пяткевіч, Е. Раманаў, А. Сержпутоўскі, М. Федароўскі, П. Шэйн і інш. На сучасным этапе да вывучэння анімалістычных вобразаў звярталіся С.Санько, А. Гурскі, У. Коваль, А. Ненадавец, Л. Салавей, І. Швед і інш. Раслінны і жывёльны коды добра прадстаўлены ў энцыклапедычных навуковых выданнях "Беларускі фальклор" і "Беларуская міфалогія". У артыкулах аўтары расшыфроўваюць кола сімвалічных значэнняў свойскіх і дзікіх жывёл у міфалагічнай карціне свету архаічнага грамадства на аснове вялікай колькасці фальклорных крыніц, а таксама навуковых доследаў, праведзеных у дадзеным рэчышчы.

У нямецкай фальклярыстыцы пачынальнікам даследавання анімалістычных вобразаў стаў Я. Грым. Пазней вобразы жывёл знайшлі адлюстраванне ў работах В. Мангарта і манаграфіі А. Губернаціса "Die Tiere in der indogermanischen Mythologie" ("Жывёлы ў індагерманскай міфалогіі"), даволі значнае месца яны займаюць у дзесяцітомным "Слоўніку нямецкіх прымхаў", над якім працавалі Х. Бахтольд-Штойблі і Э. Хофман-Крайер.

Аднак вобразы свойскіх жывёл не былі сістэматычна даследаваны ні ў айчыннай, ні ў нямецкай фальклярыстыцы, звычайна яны ўзгадаваліся ў кантэксце вывучэння іншых пытанняў і амаль не разглядаліся ў параўнальным ключы.

Другая глава **"Кампаратыўныя аспекты ў даследаванні анімалістычных вобразаў"** складаецца з чатырох раздзелаў, прысвечаных даследаванню

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Высновы і матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны: для далейшай распрацоўкі праблем, звязаных з вобразамі свойскіх жывёл; у педагагічнай дзейнасці пры выкладанні курсаў па фальклярыстыцы, духоўнай культуры, рэлігіязнаўству, этнаграфіі і культуралогіі, як у Беларусі, так і ў Германіі, а таксама пры выкладанні германістыкі ў вышэйшых навучальных установах; пры падрыхтоўцы зборнікаў, энцыклапедый, слоўнікаў, падручнікаў і метадычных дапаможнікаў.

Матэрыялы даследавання выкарыстаны пры стварэнні тэматычных радыёпраграм у дырэкцыі вяшчання на замежныя краіны Белтэлерадыёкампаніі ў перыяд з 2005 г. (даведка ад 30.10.2007). Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыі выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцый для студэнтаў Хумбальдт універсітэта (Берлін) у рамках праекта Corpus Coranicum (даведка ад 03.11.2007).

Вывады і матэрыялы працы могуць быць карысныя ў навукова-папулярным плане і выкарыстоўвацца для падрыхтоўкі грамадскіх лекцый, артыкулаў для перыядычнага друку.

СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

Артыкулы ў навуковых часопісах:

1. Вырва, І. А. Хатнія жывёлы як увасабленне духаў вегетацыі ў беларускім і нямецкім фальклоры. / І.А. Вырва // // Весн. Брэсцк. ун-та. Сер. філал. навук. – 2006. – № 3 (6). – С. 30-35.

2. Вырва, І.А. Дэманалагізацыя жывёльных вобразаў у беларускім і нямецкім фальклоры. / І.А. Вырва. // Вес. Нац. акад. навук. – 2006. – № 5. Ч. 1. Сер. Гум. навук. – С. 103-105.

3. Вырва, І. "Ой, сівы конь бяжыць..." Вобраз каня як дэманалагічнай істоты ў беларускім і нямецкім фальклоры. / І. Вырва. // Роднае слова. – 2007. – № 6. – С. 91-92.

4. Вырва, І. Анімалістычныя вобразы: параўнальны аспект. / І. Вырва. // Беларуская думка. – 2007. –№ 7. – С. 147-150.

5. Вырва, І. "Ходзіць кот па сенажаці..." Кот і сфера дзяцінства ў народных уяўленнях у беларускім і нямецкім фальклоры. / І. Вырва. // Роднае слова. – 2007. – № 11. – С. 92-93.

Артыкулы ў навуковых зборніках:

6. Вырва, І.А. Ахвярапрынашэнне жывёл і яго фальклорнае ўвасабленне ў беларускай і нямецкай традыцыях. / І.А. Вырва. // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклярыстыкі. Вып. 2. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)
фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі: навук ; рэд. А.Л. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2007. – С. 348-351.

Артыкулы ў замежных навуковых зборніках:

7. Вырва, І.А. Станоўчыя канатацыі этнакультурнага вобраза сабакі ў беларускім і нямецкім фальклоры. / І. А. Вырва // Проблемы славяноведения. Сб. Научн. ст. и материалов. Вып. 8. / Брянск. гос. ун-т; отв. ред. С. И. Михальченко. – Брянск, 2006. – С. 504-510.

8. Вырво, И. Домашние животные в народной медицине и наименованиях болезней у белорусов и немцев. / И. Вырва // Nomen est omen. Zeichen und An-Zeichen in den slawischen Sprachen / Ernst-Moritz-Arndt-Uniwersität ; hrsg. H. Walter. – Greifswald, 2007. – S. 80-83. (У суаўтарстве з Т. Валодзінай).

Матэрыялы навуковых канферэнцый:

9. Вырва, І.А. Конь у пахавальных абрадах і народных уяўленнях беларусаў і немцаў пра смерць. / І.А. Вырва // VII Шырмаўскія чытанні: матэрыялы навук. канф., Мінск, 30 лістап. 2005 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал. В. П. Рагойша [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 255-260.

10. Вырва І. А. Вобраз каня ў касмалогіі і абрадах каляндарнага цыклу ў беларускім і нямецкім фальклоры. / І. А. Вырва // Acta albarutenica, rossica, poloniса: матэрыялы VII Міжнар. навук. канф. Беларуска-Руска-Польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія / Віцебск. дзярж. ун-т; пад агул. рэд. Г. М. Мезенка, рэдкал. А. Русецкі [і інш.]. – Віцебск, 2006. – С. 382-385.

11. Вырва, І.А. Супярэчлівасць сімволікі ката ў беларускай і нямецкай традыцыі. / І.А. Вырва // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся : праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час. Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Гомель, 27 красавіка 2006 г. / Гомельск. дзярж. ун-т ; рэдкал. : А. А. Станкевіч [і інш.]. – Гомель, 2006. – С. 126-129.

12. Вырва, І.А. Жаночая семантыка вобраза каровы ў беларускім і нямецкім фальклоры. / І.А. Вырва // Мова-Літаратура-Культура: матэрыялы V міжнар. навук. канф. (да 80-годдзя Л. М. Шакуна), Мінск, 16-17 лістап. 2006 г. / Белар. дзярж. ун-т. – Мінск, 2006. – С. 465-468.

13. Вырва, І.А. Рытуальна-сімвалічныя аспекты догляду каровы. / І.А. Вырва // II Лепельскія чытанні: зб. дакл., Лепель, кастрыч. 2006 г./ Лепельск. дзярж. краязн. музей; складальн. А. У. Стэльмах. – Лепель, 2006. – С. 24-26.

14. Вырва, І.А. Да этнакультурнай характарыстыкі барана ў беларускім і нямецкім традыцыйным фальклоры. / І.А. Вырва // Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт. Вып. 4. / Пад нав. рэд. Р.М. Кавалёвай, В.В. Прыемка. – Мінск : Бестпрынт, 2007. – С. 171-175.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

РЭЗЮМЕ

Вырва Ірына Аляксандраўна

Міфапаэтычная семантыка вобразаў свойскіх жывёл у беларускім і нямецкім традыцыйным фальклоры

Ключавыя словы: анімалістычныя вобразы, зоамарфізм, анімізм, дэманалагізацыя і дэсакралізацыя вобразаў жывёл.

Мэтай дысертацыйнай работы з'яўляецца выяўленне шляхам параўнальнага аналізу асаблівасцей і агульных рыс семантыкі і функцыянальнасці вобразаў свойскіх жывёл у традыцыйным беларускім і нямецкім фальклоры.

Тэарэтычнай і метадалагічнай асновай праведзенага даследавання сталі напрацоўкі айчынных і замежных вучоных, прынцыпы аб'ектыўнасці і навуковасці. Усебаковаму раскрыццю даследуемай тэмы спрыяе спалучэнне гісторыка-генетычнага і гісторыка-тыпалагічнага параўнання.

Навуковая навізна атрыманых вынікаў заключаецца ў тым, што ў дысертацыі: 1. Праведзены гістарыяграфічны аналіз навуковых падыходаў да даследавання семантыкі вобразаў свойскіх жывёл. 2. Сістэмна прадстаўлены і прааналізаваны зоаморфныя вобразы ў розных жанрах беларускага і нямецкага фальклору. 3. У навуковы ўжытак уведзены нямецкі фальклорны матэрыял, які дагэтуль не выкарыстоўваўся ў айчынных даследаваннях.

Высновы і матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны: у педагагічнай дзейнасці пры выкладанні курсаў па фалькларыстыцы, духоўнай культуры, рэлігіязнаўству, этнаграфіі і культуралогіі, а таксама германістыкі ў вышэйшых навучальных установах; пры падрыхтоўцы зборнікаў, падручнікаў і метадычных дапаможнікаў. А таксама выкарыстоўвацца для падрыхтоўкі грамадскіх лекцыі, матэрыялаў для перыядычнага друку і спецыялізаваных тэле-, радыёпраграмм.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

РЕЗЮМЕ

Вырво Ирина Александровна

Мифопоэтическая семантика образов домашних животных в белорусском и немецком традиционном фольклоре

Ключевые слова: анималистические образы, зооморфизм, анимизм, демонологизация и десакрализация образов животных.

Цель диссертационной работы – выявление путем сравнительного анализа особенностей и общих черт семантики и функциональности образов домашних животных в традиционном белорусском и немецком фольклоре.

Теоретической и методологической основой проведённого исследования стали наработки отечественных и зарубежных учёных, принципы объективности и научности. Всестороннему раскрытию исследуемой темы способствует использование историко-генетического и историко-типологического сравнения.

Научная новизна и значимость полученных результатов заключается в том, что в диссертации 1. Проведён историографический анализ научных подходов к исследованию символики и функциональности образов домашних животных. 2. Системно представлены и проанализированы зооморфные образы с позиции семантики, функциональности в разных жанрах белорусского и немецкого фольклора. 3. В научное использование введен немецкий фольклорный материал.

Выводы и материалы диссертации могут быть использованы: в педагогической деятельности для преподавания курсов по фольклористике, духовной культуре, религиоведению, этнографии и культурологии, а также германистики в высших учебных заведениях; при подготовке сборников, учебников, и методических пособий. Также работа может использоваться для подготовки общественных лекций, материалов периодической печати и специализированных теле- и радиопрограмм.